Ю.Авяр'янаў, А.Гарцуеў; Дама — Н.Качаткова. Поп — А.Памазан, Спраўнік — Гарцуеў, І.Дзянісаў; Пан і Абарванец — В.Паўлюць, Немец, Начальнік патруля, Нямецкі афіцэр, Польскі афіцэр — У.Кін-Камінскі, А.Гарбуз; Праваслаўны свяшчэннік — У.Рагаўцоў, Каталіцкі свяшчэннік — Г.Маляўскі, Белы анёл — А.Падабед, Чорны анёл — В.Белахвосцік, Гарбуз; Жанчына з касой — З.Зубкова. Спектаклю ўласціва высокае грамадзянскае гучанне, маштабнасць. Своеасаблівую трактоўку «Т.» даў у 1990 Гродзенскі абл. т-р лялек. Рэжысёр М.Андрэеў, мастак Л.Герлаван. У ролях: Зносак — Ю.Мінько, Здольнік, Гарошка, Спічыні, Заходні вучоны, Паляк — В.Шалкевіч, Гануля, Аленка, Пабягунская, Дама — Т.Корнева, Усходні вучоны, Чырвонаармеец, Начальнік патруля — І.Цімохін. Акцёры з лялькамі дзейнічалі ў жывым плане. Спектакль вызначаўся вобразнасцю, метафарычнасцю.

*Літ.*: Васючэнка П. Драматычная спадчына Янкі Купалы. Мн., 1994; Есакоў А. Янка Купала і беларускі тэатр. Мн., 1972; Сабалеўскі А. Асоба мастака: Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1992; Яго ж. Вяртанне класікі // Спадчына. 1991. № 4.

*А.В.Сабалеўскі.*

**«ТЫЛЬ УЛЕНШПІГЕЛЬ»**, балет у 3 дзеях з пралогам Я.*Глебава.* Лібрэта А.Дадышкіліяні паводле рамана Ш. дэ Кастэра «Легенда пра Уленшпігеля». Прэм'ера на сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі адбылася ў 1974 (балетмайстар Дадышкіліяні, дырыжор Т.Каламійцава, мастак В.Левенталь; Тыль — В.Саркісьян, У.Іваноў, Ю.Раўкуць, Ю.Траян; Нэле — Л.Бржазоўская, К.Малышава; Філіп — У.Глінскіх, У.Камкоў; Рыбнік — С.Пясцехін, Я.Мінін). У 1978 паст. ў 2-й рэд. (у 2 дзеях, лібрэта, харэаграфія і пастаноўка В.Елізар'ева, дырыжор У.Машэнскі, мастак Я.Лысік, хормайстры Г.Луцэвіч, Н.Ламановіч; Тыль — Траян, Іваноў, Камкоў; Нэле — Бржазоўская, Т.Яршова, Л.Сінельнікава, Н.Дадышкіліяні; Філіп — Іваноў, А.Рымашэўскі, Раўкуць; Інквізітар — Камкоў, Пясцехін, А.Карзянкоў; Рыбнік — А.Мартынаў, С.Манзалеўскі, С.Філіпенка). Спектакль вылучаўся гіст. і філас. абагульненнямі, новым поглядам на мінулае і сучаснае ў мастацтве, адмысловай харэагр. мовай у цесным спалучэнні з музыкай і сцэнаграфіяй. Першы бел. муз.-сцэн. твор, пастаўлены за межамі Беларусі (1-я рэд. — 1975, Львоў; 1976, Чэлябінск; 1977, Хельсінкі; 2-я рэд. — 1977, Ленінград). У балеце выяўлена імкненне сродкамі харэаграфіі ўвасобіць сутнасць апісанай у творы дэ Кастэра эпохі смутнага часу ў гісторыі Нідэрландаў.

*Літ.*: Чурко Ю.М. Белорусский балетный театр. Мн., 1983. С. 117—133.

*Т.У.Аляксандрава.*

**ТЫПА́Ж** (франц. typage), 1) выканаўца, які па сваіх знешніх даных адпавядае пэўнай ролі. 2) Умоўны *персанаж*, які валодае фізічнымі, псіхал. або маральнымі характарыстыкамі, знаёмымі гледачам. Т. зафіксаваны традыцыяй, часам набліжаны да вобраза-маскі (напр., героі італьян. камедыі дэль артэ, бел. батлейкі, нар. тэатра), уяўляе сабой калі не індывіда, то ролю, характэрную для пэўнага стану ці недахопу. Т. надзелены некат. чалавечымі і гіст. дакладнымі рысамі, але не мае індывідуальнасці, якая разам з арыгінальнымі рысамі характару ахвяруецца абагульненню і перабольшванню. Глядач вызначае Т. па псіхал. рысах, сац. асяроддзі або вызначальнай дзейнасці. Т.-персанажы лёгка ўключаюцца ў інтрыгу і служаць гульнёвым выразным аб'ектам, таму найчасцей сустракаюцца ў тэатр. формах з яркай гіст. традыцыяй, дзе характары паўтараюцца, прадстаўляюць станоўчыя чалавечыя рысы ці недахопы, якія крытыкуе драматург. Некат. віды драматургіі не абыходзяцца без Т. (фарс, камедыі характараў). У бел. тэатр. мастацтве Т. сустракаецца ў тэатралізаваных формах нар. святкаванняў, батлейцы, нар. інтэрмедыях, нар. драме (напр., цар Ірад, Аніка-воін, Дзед, Цыган, Яўрэй, Доктар-шарлатан, Чорт і інш.). Т. — сэнсава блізкае паняцце *амплуа.*

*І.А.Алексніна.*

**ТЫШКЕ́ВІЧАВЫ ТЭА́ТРЫ**, прыватныя тэатр. трупы ў 18—19 ст. у рэзідэнцыях магнатаў Тышкевічаў — Свіслачы (гл. *Свіслацкі тэатр Тышкевіча*) і Плешчаніцах (Лагойскі р-н). Пра дзейнасць Плешчаніцкага т-ра вядома ў 1820—30-я гады. Тэатр быў аматарскі, але найчасцей у ім выступалі прафесійныя трупы, што гастраліравалі ў Свіслачы. Меў добрае тэхн. абсталяванне, некалькі камплектаў дэкарацый і касцюмаў, якія пасля пажару ў 1835 перададзены тэатру ў Мінску.

*Літ.*: Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. Мн., 1983. С. 211.

**ТЭА́ТР** (ад грэч. theatron месца для відовішча), 1) род мастацтва, у якім сцэнічнае дзеянне ажыццяўляюць *акцёры.* Т. адлюстроўвае грамадскую свядомасць, цесна звязаны з жыццём народа, нац., гіст. каранямі, традыцыямі і сучаснымі дасягненнямі культуры. Тэатр. мастацтва ўвасабляе багатае



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ